


# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.43 | 20.33 | 14.50 |
| Віцебск — | 5.29 | 20.26 | 14.57 |
| Магілёў — | 5.33 | 20.23 | 14.50 |
| Гомель — | 5.34 | 20.15 | 14.41 |
| Гродна — | 5.59 | 20.47 | 14.48 |
| Брэст — | 6.04 | 20.43 | 14.39 |

## Месяц

*Поўня 24 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

*Пр.* *Артамона.*
*К.* *Клаўдзіі, Марцэліны, Марыі, Васіля, Рышарда.*



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Надвор'е

# ТЭМПЕРАТУРНЫЯ «АРЭЛІ»

## Уначы замаразкі, а днём прыгрэе да плюс 22

**Калі на старце красавіка дзёны максімум тэмпературы дасягаў 25 градусаў і вышэй, усе ўжо вырашылі, што канчаткова прыйшла цёплая вясна. Як аказалася, другі месяц вясны падманлівы, і пасля значнага цяпла абавязкова прыходзіць сур'ёзная хваля холаду. Гэтыя выхадныя з'яўляюцца таму пацвярджэннем, бо ноччу чакаюцца замаразкі, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

І ў пятніцу надвор'е застанецца «цяжкім». Па ўсходняй палове краіны яго будуць вызначаць атмасферныя франты, на астатняй частцы тэрыторыі адаб'еццa ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Воблачна з праясненнямі. Тэмпература паветра мінімальна ноччу 1—7, па паўднёвым усходзе 8—11 цяпла, але месцамі па захадзе Беларусі чакаюцца замаразкі да мінус 1 градуса. Максімальная тэмпература паветра днём 9—15 цяпла, ва ўсходніх раёнах плюс 16—19 градусаў. Атмасферны ціск будзе расці.

Верагоднасць начных замаразкаў захаваецца і ў суботу. Чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Толькі ўначы па паўночным усходзе краіны месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўночна-заходні з пераходам на паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы 1—7 цяпла, але месцамі замаразкі да мінус 2 градусаў, а максімальная тэмпература паветра ўдзень — 12—19 цяпла.

У нядзелю пацяплее. Надвор'е будуць фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску і цёплая паветраная маса, якая распаўсюдзіцца з паўднёвага захаду Еўропы. Пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер пераменных напрамкаў умераны. Тэмпература паветра ўначы плюс 2—8 градусаў, удзень — 15—22 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ❍ У тэму

Халады замарудзілі развіццё сельгаскультур і адрастанне шматгадовых траў, паведамілі сіноптыкі.

Пасля моцных дажджоў ва ўсходняй палове краіны ўтрыманне вільгаці ў глебе істотна павялічылася. На апошніх даных візуальных назіранняў, умеранае ўвільгатненне верхняга 10-сантыметровага пласта глебы захоўваецца на большай тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай, а таксама ў шэрагу раёнаў Мінскай і Гомельскай абласцей. На астатняй тэрыторыі Беларусі верхні слой глебы моцна і залішне ўвільгатнены. На паўночным захадзе краіны ўтварылася невялікае снежнае покрыва вышынёй да двух сантыметраў. Сярэдняя тэмпература глебы на глыбіні 10 сантыметраў панізілася і складае ў асноўным плюс 5—9 градусаў. Усталявалася халоднае надвор'е, якое замарудзіла развіццё сельскагаспадарчых культур, адрастанне шматгадовых траў.

Паводле інфармацыі аграметэаралагаў, у сувязі з чаканымі ападкамі ў найбліжэйшыя дні захаваецца даволі складаная аграметэаралагічная абстаноўка, плошчы з пераўвільгатненнем будуць пашырацца.

# ЗАЎТРА




## 26 КРАСАВІКА — Даты. Падзеі. Людзі

**У краіне**

**1586** год — у Магілёве ўтварылася праваслаўнае брацтва, адно з першых на Беларусі.

**1863** год — нарадзіўся (в. Славенск Ашмянскага павета) Яўстафій Філарэтавіч Арлоўскі, беларускі краязнавец, гісторык, педагог. Даследаваў гісторыю Гродна і даказаў яго тоеснасць з летапісным Гарадзенам.



**1899** год — нарадзіўся (в. Засмосце, цяпер — Уздзенскі раён) Ілья Гурскі, беларускі савецкі пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры БССР. У 1935—1941 гадах — рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». У гады Вялікай Айчыннай вайны з першага дня і да лістапада 1942 года служыў у Чырвонай Арміі. Затым разам з групай беларускіх пісьменнікаў быў дэмабілізаваны. Рэдактар газеты «За свабодную Беларусь» і сатырычнага лістка «Партызанская дубінка». Пасля вайны ў 1944—1960-м узначальваў часопіс «Беларусь». Аўтар п'ес, апавяданняў, аповесцяў і раманаў: «У агні», «Вецер стагоддзя», «Чужы хлеб» і інш. Перакладаў на беларускую мову М. Горкага, А. Чэхава, М. Твэна.

**1929** год — нарадзіўся (в. Гарадзец Рагачоўскага раёна) Мікалай Мікітавіч Слюнькоў, савецкі партыйны дзеяч, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. У 1974—1983 гадах — намеснік старшыні Дзяржплана СССР. У 1983—1987 гадах — першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі. Пасля — сакратар ЦК КПСС, член Палітбюро ЦК КПСС, адначасова ў 1987—1988 гадах — загадчык Эканамічнага аддзела ЦК КПСС.

**У свеце**

**1607** год — заснаванне Джэймстаўна, першага паселішча брытанскіх каланістаў на тэрыторыі сучасных ЗША.



**1798** год — нарадзіўся Эжэн Фэрдынанд Віктор Дэлакруа, французскі жывапісец і графік эпохі рамантызму, творчасць мастака моцна паўплывала на ўзнікненне новага жывапіснага кірунку — імпрэсіянізму.

**1937** год — у час грамадзянскай вайны ў Іспаніі нацысты ўчынілі варварскую бамбардзіроўку горада Герніка. У выніку ўзнік пажар, які знішчыў большую частку горада з-за запозненага прыбыцця і неадэкватных дзеянняў пажарных з Більбаа. Менавіта пажар, а не непасрэдна авіяналёт з'явіўся прычынай катастрафічных разбурэнняў (не менш за 75 % пабудоў). Ацэнкі колькасці чалавечых ахвяр значна адрозніваюцца: ад 120 чалавек да 300 у залежнасці ад палітычных поглядаў тых, хто рабіў іх падлік (першая лічба — падлікі гісторыкаў, якія сімпатызавалі нацыяналістам Франка, другая прынята ў Краіне Баскаў).

**1986** год — тэхнагенная катастрофа на Чарнобыльскай АЭС. У выніку адбылося моцнае забруджванне часткі тэрыторыі Беларусі радыеактыўнымі выкідамі са станцыі, у меншай ступені пацярпелі Расія і Украіна.

**Так гаварыў...**

**ІВАН БУНІН:**

*«Жанчыны ніколі не бываюць такімі моцнымі, як тады, калі яны бяруць на ўзбраенне слабасць».*

## УСМІХНЕМСЯ





**Спадара Івана АСТРОЎСКАГА, жыццялюба, педагога, дацэнта БДУІРа, адданага падпісчыка «Звязды», шчыра віншуем з прыгожай круглай датай, з 85-годдзем! Зычым вам, шаноўны Іван Іванавіч, моцнага здароўя, бадзёрасці, поспехаў у працы (яшчэ і на зямлі), чакаем новых вершаў, баек, прыпевак — для газеты, для новых кніг!**

**Звяздоўцы.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.836. Індэкс 63850. Зак. № 903.

Нумар падпісаны ў 19.30 25 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12